В.А. Прыходзька

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## Паўрочныя заданні

## 1 клас




•ЭКОПЕРСПЕКТИВА•

В. А. Прыходзька

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## 1 клас

### Паўрочныя заданні

*Дапаможнік для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання*

Мінск
«Экоперспектива»
2022

УДК 811.161.3(075.2=161.1)
ББК 81.2Беи-922
П75

Р э ц э н з е н т ы:
настаўнік пачатковых класаў першай катэгорыі
ДУА «Сярэдняя школа № 67 г. Гомеля» *Г. П. Жумігіна*;
настаўнік пачатковых класаў вышэйшай катэгорыі
ДУА «Гімназія № 51 г. Гомеля» *Н. М. Іваніс*

**Прыходзька, В. А.**
П75 Беларуская мова : 1-ы кл. : паўрочныя заданні : дапам. для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання / В. А. Прыходзька. — Мінск : Экоперспектива, 2022. — 95 с. : іл.
ISBN 978-985-469-936-3.

Дапаможнік складзены згодна з праграмнымі патрабаваннямі да вучэбнага прадмета «Беларуская мова» для 1 класа і прызначаны для выкарыстання на вучэбных занятках ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання.

Сшытак уключае разнастайныя заданні, якія дапамогуць першакласнікам у форме гульні засвоіць вучэбны матэрыял і пашырыць слоўнікавы запас.

Адрасуецца настаўнікам, вучням, бацькам.

**УДК 811.161.3(075.2=161.1)**
**ББК 81.2Беи-922**

**ISBN 978-985-469-936-3**

© Прыходзька В. А., 2022
© Афармленне.
УП «Экоперспектива», 2022

# Умоўныя абазначэнні

Скорагаворка

Слоўнік

Чытанне

Падумай!

Запішы

Прыказкі, прымаўкі і народныя прыкметы

Інтэрактыўныя гульні

# Прадмова

У сшытку прадстаўлены дадатковыя паўрочныя заданні для вучэбных заняткаў па тэмах, прадугледжаных вучэбнай праграмай.

Кожны занятак складаецца з дзвюх частак: замацаванне вывучанай тэмы і заданні на больш шырокае знаёмства з пэўнай літарай і гукам.

Кожная тэма ўключае скорагаворку, слоўнік, заданні для замацавання тэмы, тэкст для чытання, заданні для чытання і ўзбагачэння слоўнікавага запасу на прапанаваныя літары і гукі, прымаўку і заданне для пісьма. У многіх занятках змешчаны спасылкі на электронныя гульні, якія дапамогуць замацаваць веды па дадзенай тэме. У электронных гульнях змешчана большая колькасць слоў, чым у сшытку, што дазволіць пашырыць слоўнікавы запас вучняў.

Шмат заданняў накіравана на развіццё пазнавальных здольнасцей, што дапаможа вучням ў цікавай форме трывала засвоіць вучэбны матэрыял.

Прапаную разгледзець некаторыя гульні.

**«Блытаніна»**

Гэта анаграмы. У дадзеных заданнях у слове перастаўлены склады або літары, а таксама ёсць словы, у якіх літары чытаюцца справа налева.

## «Граматычная арыфметыка»

Каб атрымаць слова, неабходна выконваць прапанаваныя дзеянні. Калі стаіць «+», мы дадаем прапанаваныя літары, калі стаіць «—», мы закрэсліваем указаныя літары ці склады. Напрыклад:

***Труба — рба + рысь — ь + т = труба — рба = ту + рысь = = турысь — ь = турыс + т = турыст***

## «Падскокі»

Прачытайце словы, якія складаюцца з двух або трох складоў. Пачаткам кожнага наступнага слова будзе з'яўляцца канчатак папярэдняга слова. Дзеці робяць як бы падскок на адным месцы і чытаюць склад яшчэ раз. Напрыклад, чытаем: *авёс, вёска, кава, вавёрка, капа, палёт, лётчык.*




## «Пазлы»

Пазлы патрэбна прачытаць так, каб атрымалася слова. Ёсць заданні, у якіх словы запісаны правільна, патрэбна толькі знайсці, дзе пачатак слова. Ёсць «Пазлы», у якіх дэталькі пераблыталіся, і, каб прачытаць слова, неабходна прасачыць вачыма і злучыць парадак літар алоўкам.

## «Хованкі»

У словах схаваліся іншыя словы, якія патрэбна знайсці і абвесці.

Дж(ала), (джэм)пер.

## «Чарадзей»

Па першых літарах слоў у кожным радку патрабуецца скласці новае слова. Да гэтага тыпу заданняў адносяцца загадкі ва ўроках 19, 20, у якіх патрэбна знайсці, дзе схавалася адгадка. Напрыклад:

***Прачытайце пяць слоў і знайдзіце шостае.***

*чай-ка   а-лень   ра-ка   ор-дэн   тру-ба*

## «Чароўны гадзіннік»

У гэтым заданні неабходна ўспомніць, якая лічба хаваецца за кожнай літарай і адгадаць словы. Пры выкананні задання першы раз можна выкарыстаць сапраўдны гадзіннік і пры яго дапамозе знайсці неабходныя літары.

Жадаю поспехаў у вывучэнні роднай мовы!

# 1. Наша мова

Ідзі ў родны край, там і пад елкаю рай.

| | |
|---|---|
| мама | мама |
| тата | папа |
| людзі | люди |
| Радзіма | Родина |
| краіна | страна |

| | |
|---|---|
| мова | язык |
| размаўляць | разговаривать |
| дзякуй | спасибо |
| калі ласка | пожалуйста |
| васілёк, валошка | василёк |

❖ **Назавіце жывёл на кожным малюнку. Лічбы падкажуць, якая па парадку літара патрэбна для новага слова. Кожную літару запішыце ў клетачку.**



1 2 1 1



1 2 1 4

❖ **Паглядзіце, з якімі цацкамі гулялі дзеці раней.**



❖ **Надпісы на кубіках з'яўляюцца складамі іншых слоў. Злучыце кубікі першага і другога радоў, каб атрымаліся словы.**






Я рус-кую мо-ву люб-лю і ву-чу.
І на-шу так-са-ма я ве-даць ха-чу.
Бук-вар бе-ла-рус-кі пра-шу мне ку-піць —
І род-ну-ю мо-ву пач-ну я ву-чыць.

*М. Пазнякоў*

**Прачытайце склады.**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| бі | ві | гі | зі | кі |
| лі | мі | ні | сі | ці |

# Змест

**Умоўныя абазначэнні** ........ 3

**Прадмова** ........ 3

**Наша мова**

1. Наша мова ........ 5

**Я і мая школа**

2. Настаўніца і вучні ........ 7
3. Вучэбныя рэчы ........ 10
4. Школьныя памяшканні ........ 13
5. Вучэбныя заняткі ........ 17

**Я і мая сям'я**

6. Мае сваякі ........ 20
7. Мая кватэра ........ 23
8. Рэжым дня ........ 26
9. Асабістая гігіена ........ 29
10. Адзенне і абутак ........ 32

**Я і мае сябры**

11. Знаёмімся з сябрамі ........ 34
12. Гуляем разам ........ 37
13. Запрашаем на дзень нараджэння ........ 40

**Я і мае справы**

14. У доме (хаце) ........ 43
15. На вуліцы (у двары) ........ 46
16. У краме ........ 49
17. На пошце ........ 52

**Я і навакольны свет**
18. Надвор’е, з’явы прыроды ........................................ 54
19. Поры года і занятак людзей .................................... 57
20. Я і жывёльны свет ..................................................... 60
21. Я і раслінны свет ....................................................... 63

**Мясціна, дзе я жыву**
22. Мая краіна ................................................................. 65
23. У родным горадзе (вёсцы) ........................................ 68
24. Наша наваколле ........................................................ 70
25. Славутыя землякі ...................................................... 73
26. Памятныя мясціны .................................................... 76

**Я і мая Радзіма**
27. Сімвалы Беларусі ...................................................... 78
28. Гонар Беларусі .......................................................... 81
29. Святы на Беларусі ..................................................... 84
30. Я і мая мова ............................................................... 86

**Адказы** ............................................................................. 90

**Спіс літаратуры** ............................................................. 92

ISBN 978-985-469-936-3